

МАМА НА ТРЭНІРОЎЦЫ, ТАТА Ў ДЭКРЭЦЕ

ПРЫГАЖОСЦЬ ПАТРАБУЕ АХВЯР?




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

20 КРАСАВІКА 2023 г. ЧАЦВЕР № 75 (29955)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід МАРТЫНЮК, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці:**

*«У невялікіх населеных пунктах медыцынскія работнікі ва ўсе часы былі вельмі паважанымі людзьмі, да думак і меркаванняў якіх грамадзяне заўсёды прыслухоўваліся. Такая тэндэнцыя захоўваецца і цяпер. А таму мы можам казаць аб тым, што, паводле меркавання медработнікаў на месцах, з іх рэакцыі на розныя падзеі фарміруецца грамадская думка як адносна сферы аховы здароўя, так і ўсёй вертыкалі ўлады — як у рамках рэгіёна, так і ўсёй краіны».*

## КОРАТКА

- **У Беларусі за 2023 год плануюць пасадзіць 32 тысячы гектараў лесу.**
- За 2022 год у Беларусі выдадзена больш за 237 тысяч біяметрычных дакументаў.
- **Тактычнае вучэнне з адным з падраздзяленняў зенітных ракетных войскаў праводзіцца ў Беларусі.**
- Пінск у 2024 годзе прыме абласны фестываль-кірмаш «Берасцейскія сані».

**Мінлясгас: наведваць лясы бесперашкодна можна па ўсёй Беларусі.**

- Новае абсталяванне плануецца паставіць на Добрушскі фарфоравы завод.
- **«Белавія» 23 мая адкрые прамы рэйс у Мурманск.**
- Інфармацыйна-адукацыйны праект для школьнікаў па рацыянальным харчаванні стартуе ў Мінску.


ISSN 1990 — 763X

23075


# Дакрануцца да подзвігу




Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Учора ў сталічным Доме афіцэраў разгарнулася цікавая выстава, на якой свае праекты і дасягненні прадставілі ваенна-патрыятычныя клубы, створаныя на базе вайсковых часцей і ўстаноў адукацыі.**

**Напрыклад, дзевяцікласнік сталічнай гімназіі № 7 Ілья КОРЗУН зладзіў прэзентацыю партала belaruswar.by.**

**Ілья — дызайнер і распрацоўшчык гэтага сайта, прысвечанага Вялікай Айчыннай вайне. Цяпер хлопец працуе над новым праектам — стварае віртуальную экскурсію па Пакоі баявой славы ў сваёй гімназіі, якая раскажа аб юных героях.**


*(Працяг тэмы на 2 стар.)*


Погляд збоку

## ЗА ДВУМА «ЗАЙЦАМІ»

### У пагоні за безбілетнікамі




**Многія з нас хоць аднойчы ў жыцці праязджалі ў грамадскім транспарце без білета, імкнучыся ці то ўхапіць крыху адрэналіну, ці то сэканоміць капейчыну. Аднак не заўсёды такія азартныя вандроўкі заканчваюцца на добрай ноце, і ўважлівыя кантралёры ўручаюць недобрасумленным пасажырам пастановы. Карэспандэнт «Звязды» выправілася ў рэйд з работнікамі ДП «Аператар перавозак» па Віцебску і даведалася, якімі спосабамі грамадзяне ўхіляюцца ад аплаты праезду.**


СТАР. 3


Сітуацыя

## Гамбіт па-сухарэўску

### Жыхары аграгарадка Магілёўскага раёна занепакоены пераменамі ў іх гаспадарцы

**Аграгарадок Сухары знаходзіцца недалёка ад Магілёва. У даволі вялікім населеным пункце знаходзіцца і цэнтр сельсавета. Здавалася б, праблемы з развіццём у «прыгарадным» (каля абласнога цэнтра) паселішчы ўзнікаць не павінна. Аднак у Сухарах не ўсё так проста. Праблема — у мясцовым сельгаспрадпрыемстве. Дакладней, у яго рэфармаванні.**

**Спачатку, звярнуўшыся ў карпункт «Звязды», праблему агучыў старшыня пярвічнай ветэранскай арганізацыі ТАА «Сухары Агра» Мікалай ВАЛЮЖЭНІЧ. Ён паведаміў, што таварыства абанкруцілася і практычна спыніла сваё існаванне. Тое, што ад яго засталося, новы інвестар перафармаціраваў. У выніку частка былых работнікаў вымушана ездзіць на работу ў іншы населены пункт за больш як 30 кіламетраў. Жыхары Сухароў занепакоеныя: няма работы на месцы — якое ж жыццё? У роспачы яны напісалі ліст у самую высокую інстанцыю. Карэспандэнту «Звязды», якая прыехала разбірацца ў сітуацыі, адразу паказалі яго копію.**


СТАР. 4

Парламенцкі дзённік

# Складнікі фінансавай стабільнасці

## Павел КАЛАУР праінфармаваў аб асноўных выніках дзейнасці Нацыянальнага банка і задачах, якія стаяць перад банкаўскай сістэмай у бягучым годзе

**Выступленне-справаздача старшыні праўлення Нацыянальнага банка на сумесным пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі — адна з традыцый, закладзеная абноўленай Канстытуцыяй. Згодна з Асноўным Законам краіны, парламентарыі будуць заслухоўваць даклад старшыні праўлення Нацбанка, як і генеральнага пракурора, і старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю, штогод.**

**Мы сабралі для чытачоў самыя цікавыя моманты з выступлення кіраўніка Нацбанка.**

### Ад чаго залежалі стаўка рэфінансавання і курс рубля

«Пасля ўвядзення маштабных санкцый у мэтах недапушчэння дэстабілізацыі на ўнутраным рынку, а таксама стрымлівання інфляцыйных працэсаў Нацыянальны банк павысіў стаўку рэфінансавання. З 1 сакавіка мінулага года яна павялічылася з 9,25 да 12 % гадавых і да канца года захоўвалася нязменнай. У сваю чаргу, банкі ў сакавіку—красавіку павялічылі даходнасць па зберажэннях у нацыянальнай валюце. Ужо ў маі 2022 года па меры стабілізацыі сітуацыі на ўнутраным рынку працэнтныя стаўкі пачалі зніжацца. Як вынік, сярэдні кошт новых рублёвых крэдытаў, прадстаўленых банкамі і Банкам развіцця юрыдычным асобам, у канцы мінулага года склаўся на ўзроўні 9,7 % гадавых. У сакавіку бягучага года — 8,97 % гадавых», — адзначыў Павел Калаур.

З мэтай забеспячэння летась устойлівага функцыянавання валютнага і дэпазітнага рынкаў, якія з'яўляюцца найважнейшымі складнікамі фінансавай стабільнасці ў краіне, Нацыянальны банк працягнуў правядзенне курсавой палітыкі ў рэжыме плаваючага курса. Дынаміка курса беларускага рубля ў 2022 годзе ў многім вызначалася змяненнем курса расійскай валюты, адлюстроўваючы значнасць расійскага рынку ў знешнім гандлі Рэспублікі Беларусь. За 2022 год афіцыйны курс беларускага рубля ў адносінах да расійскага знізіўся на 10,2 %, да долара ЗША — на 7,4 %, умацаваўся да кітайскага юаня на 3,4 %. Гібкасць валютнага курса нароўні са спрыяльнымі тэндэнцыямі ў знешнім гандлі, па словах старшыні праўлення Нацбанка, дазволілі забяспечыць збалансаванасць валютнага рынку і не дапусціць звышланавага зніжэння золатавалютных рэзерваў.

Як звярнуў увагу Павел Калаур, стабільная сітуацыя на валютным рынку і ўстойлівасць золатавалютных рэзерваў пазітыўна адбіліся на дынаміцы збераженняў у нацыянальнай валюце. «Па выніках 2022 года аб'ём тэрміновых рублёвых дэпазітаў насельніцтва ў банкаўскім сектары павялічыўся на 25 %, за I квартал бягучага года — на 6,1 %, — паведаміў ён. — Пры гэтым на 1 красавіка 2023 года доля доўгатэрміновых дэпазітаў у агульным аб'ёме тэрміновых і ўмоўных укладаў насельніцтва склала амаль 72 %. Такая дынаміка ўкладаў спрыяльна адбілася на рэсурсным патэнцыяле банкаўскага сектара, сфарміраваўшы базавыя ўмовы для яго ўстойлівага функцыянавання».

### Аплаціць з мабільнага і пазычыць грошы ў сотавага аператара

Падрыхтаваны праект Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, які дае права аператарам сотавай сувязі выдаваць нашым грамадзянам пазыкі на спажывецкія патрэбы ў суме, якая не перавышае 200 базавых велічынь.

— З аднаго боку, гэта дазволіць забяспечыць павышэнне доступу фізічных асоб да фінансаў, — растлумачыў Павел Калаур. — З іншага — даванне мікрапазык з выкарыстаннем лічбавых тэхналогій, з правядзеннем адпаведнай ідэнтыфікацыі пазычальніка выведзе мікрафінансаванне на новы ўзровень, які адпавядае цяперашнім рэаліям.

Старшыня праўлення Нацбанка таксама паведаміў, што актыўна развівалася сістэма безнаяўных разлікаў па розначных плацяжах. На канец 2022 года доля безнаяўнага грашовага абароту ў розначным таваразвароце вырасла на 0,9 % і дасягнула 51 %. Для параўнання, у 2014 годзе яна складала менш за 19 %.

У мэтах зніжэння затрат арганізацый гандлю і сэрвісу на прыём безнаяўных плацяжоў за тавары (работы, паслугі) большасць банкаў прапануе кліентам магчымасць ажыццяўлення плацяжоў з дапамогай мабільнага дадатку з выкарыстаннем QR-кодаў. Пры гэтым у аснове тэхналогій, якія дазваляюць ініцыяваць плацяжы непасрэдна з банкаўскіх рахункаў або электронных кашалькоў, ляжаць айчынныя распрацоўкі.

### Фінансавая абароненасць

Пытанням кібербяспекі Нацыянальным банкам аддаецца асаблівая ўвага. «Колькасць кіберзлачынстваў у фінансавай сферы за апошнія некалькі гадоў істотна вырасла, — падкрэсліў Павел Калаур. — Асноўная іх частка звязаная з сацыяльнай інжынерыяй, калі грамадзяне самі даюць зламысныкам інфармацыю для доступу да сваіх рахункаў. У сувязі з гэтым на працягу мінулага года Нацыянальным банкам сумесна з праваахоўнымі органамі арганізавана шырокамаштабнае інфармаванне насельніцтва аб сучасных метадах і спосабах здзяйснення кіберзлачынстваў, мерах па іх прафілактыцы. Зацверджаны патрабаванні па забеспячэнні абароны інфармацыі і забеспячэнні кібербяспекі пры аказанні плацежных паслуг».

### Пераемнасць грашова-крэдытнай палітыкі і інфармацыйная бяспека

Гаворачы аб задачах, якія стаяць перад банкаўскай сістэмай, Павел Калаур запэўніў, што ў найбліжэйшыя гады грашова-крэдытная палітыка захавае сваю пераемнасць. «Ключавой задачай бачыцца выхад на параметры па інфляцыі, прадугледжаныя пяцігадовай праграмай, і іх устойлівае замацаванне ў далейшай перспектыве, — акцэнтаваў увагу кіраўнік Нацбанка. — Нагадаю, што ў якасці сярэднетэрміновага арыенціра нізкай інфляцыі вызначана падтрыманне прыросту спажывецкіх цэн на ўзроўні каля 5 %».

Па меры запавольвання інфляцыі Нацыянальны банк ужо сёлета знізіў стаўку рэфінансавання на 1,5 працэнтнага пункта да 10,5 % гадавых. Ацэньваецца, што ў сярэднім за год яе ўзровень складзе каля 10 % гадавых. У цэлым працэнтная палітыка Нацыянальнага банка захавае накіраванасць на падтрыманне працэнтных ставак у эканоміцы на станоўчым узроўні ў рэальным выражэнні.

Таксама ў мэтах фарміравання ўстойлівай рэсурснай базы банкаў, неабходнай для пашырэння крэдытавання, будуць прыняты меры па развіцці доўгатэрміновага дэпазітнага рынку, а таксама па павелічэнні долі рублёвых зберажэнняў. Працягнецца стымуляванне банкаў на пашырэнне падтрымкі інвестыцыйнай актыўнасці ў краіне. Прыярытэт будзе аддавацца эфектыўным праектам, а таксама стымуляванню экспарту і імпартазамяшчэння.

У 2023 годзе працягнецца ўдасканаленне сістэмы абароны правоў спажыўцоў фінансавых паслуг, у тым ліку яе прававога рэгулявання. «Асаблівая ўвага будзе ўдзелена распаўсюджванню добрасумленных практык аказання фінансавых паслуг, а таксама парадку разгляду скаргаў і іх ўрэгулявання са спажыўцамі, — заўважыў старшыня праўлення Нацыянальнага банка. — Намечаны мерапрыемствы па развіцці ўзаемадзеяння Нацыянальнага банка з банкамі і дзяржаўнымі органамі ў галіне інфармацыйнай бяспекі. Мяркую, што паспяховая рэалізацыя Нацыянальным банкам усіх запланаваных мер будзе садзейнічаць фарміраванню ўмоў для ўстойлівага росту дабрабыту і павышэння якасці жыцця насельніцтва».

**Вераніка КАНЮТА.**

# У патрыятычнай рабоце не павінна быць выпадковых людзей

**Аб гэтым заявіў журналістам да пачатку пасяджэння Рэспубліканскага міжведамаснага каардынацыйнага савета па патрыятычным выхаванні намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар ЛУЦКІ.**



Фота БелТА.

Паводле слоў Ігара Луцкага, у краіне даўно створаны ваенна-патрыятычныя клубы. Цяпер першачарговая задача — наладзіць іх узаемадзеянне. У моладзі высокая цікавасць да гістарычнай тэматыкі. Ваенна-патрыятычнае выхаванне знаходзіцца ў цэнтры ўвагі і Міністэрства абароны, і МУС. «У дадзенай справе не павінны з'яўляцца людзі выпадковыя, якія не разумеюць, што такое педагогіка. Прэзідэнт сказаў: патрыёта можа выхаваць толькі патрыёт. А тыя людзі, якія спрабуюць на гэтым зарабіць сабе бонусы, ні ў якім разе не павінны дапускацца да дзяцей», — лічыць Ігар Луцкі.

Першымі на пасяджэнні былі разгледжаны пытанні, якія курыруе Міністэрства спорту і турызму. У прыватнасці, Ігар Луцкі лічыць неабходным перад стартам чарговага турыстычнага сезона пагллядзець экскурсійнае забеспячэнне турыстычных аб'ектаў. Асабліва тых, якія звязаны з трагічнымі падзеямі на беларускай зямлі.

Таксама на сустрэчы абмяркоўвалася дзейнасць пошукавых атрадаў, ДТСААФ, Беларускай федэрацыі армейскага рукапашнага бою і сучаснага панкратыёну. Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя прадставіла праект «Беларусь памятае». «Роля грамадскіх аб'яднанняў у пытаннях ваенна-патрыятычнага выхавання павінна ўзрастаць», — лічыць Ігар Луцкі.

Наступнай тэмай, якую абмяркуе каардынацыйны савет, стане захаванне і папулярызацыя сямейных каштоўнасцяў. «Дэмаграфічная бяспека для нашай краіны — пытанне нумар адзін. З сям'і пачынаецца выхаванне грамадзяніна і патрыёта», — лічыць Ігар Луцкі.

**Паводле БелТА.**

# Бюджэт, ядзернае паліва і міжнародны гандаль

## У Савеце Рэспублікі адобрылі шэраг законапраектаў

**Падчас пасяджэння дзясятай сесіі Савета Рэспублікі сенатарамі былі адобраны законапраекты, якія датычацца Бюджэтнага кодэкса, змянення некаторых законаў. На парадку дня былі пытанні абыходжання з ядзерным палівам і дакументы, якія рэгулююць міжнароднае супрацоўніцтва.**

Члены Савета Рэспублікі адобрылі праект **Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні Бюджэтнага кодэкса Рэспублікі Беларусь». Старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ** расказала, што дадзены законапраект прадугледжвае ўнясенне кропкавых змяненняў у Бюджэтны кодэкс. Такая неабходнасць узнікла ў сувязі з тым, што раней былі абноўлены некаторыя законы, якія вызначылі канкрэтныя напрамкі бюджэтных расходаў, не замацаваныя ў Бюджэтным кодэксе. І цяпер трэба прывесці ўсё ў адпаведнасць. «З 1 студзеня 2023 года Падатковым кодэксам уведзены падатак на прафесійны даход. У Бюджэтным кодэксе не было вызначана, у які з узроўняў бюджэтаў паступае згаданы падатак. Цяпер гэта ўсё адкарэкціравана, — растлумачыла сенатар. — Калі казаць пра канцэптуальныя змяненні Бюджэтнага кодэкса, то яны будуць, яны цяпер прапрацоўваюцца як Міністэрствам фінансаў, так і мясцовымі органамі ўлады»

Падчас пасяджэння быў адобраны праект **Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Расійскай Федэрацыі аб супрацоўніцтве ў галіне абыходжання з адпрацаваным ядзерным палівам».** Прадмет пагаднення — увоз апрамененых цеплавыдзяляльных зборак ядзерных рэактараў у Расійскую Федэрацыю для часовага тэхналагічнага захоўвання з далейшай перапрацоўкай, а таксама вяртанне ў Беларусь радыеактыўных адходаў.

**Сенатары адобрылі праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні законаў»**, які падрыхтаваны ў сувязі з укараненнем у краіне біяметрычных дакументаў новага пакалення. Змяненні закранулі Законы «Аб воінскім абавязку і воінскай службе», «Аб прадастаўленні замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства статусу бежанца, дадатковай абароны, прыстанішча і часовай абароны ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб парадку выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь грамадзян Рэспублікі Беларусь», «Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь».

Праектам закона ўдакладняюцца падставы для давання права на адтэрміноўку ад прызыву на воінскую службу, устанаўліваецца часовае абмежаванне на выезд з Рэспублікі Беларусь асоб, адносна якіх вядзецца адміністрацыйны працэс, дадзецца права Камітэту дзяржаўнай бяспекі часова абмяжоўваць выезд фізічных асоб з Рэспублікі Беларусь у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, прадугледжваецца дадатковае рэгуляванне парадку выезду за мяжу супрацоўнікаў дзяржаўных органаў.

Змяненні ў прыведзеныя законы сапраўды запатрабаваныя часам. Як паведаміў **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ**, за 2022 год у Беларусі выдадзена больш за 237 тысяч біяметрычных дакументаў, якія пацвярджаюць асобу. Па словах міністра, гэта і грамадзяне Рэспублікі Беларусь, і тыя грамадзяне, якія часова пражываюць на нашай тэрыторыі. «На сённяшні развіццё біяметрычных дакументаў ідзе і ўсё больш грамадзян атрымліваюць біяметрычныя дакументы», — сказаў Іван Кубракоў.

Адабрэнне сенатараў атрымаў праект **Закона «Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Расійскай Федэрацыі аб рэалізацыі Праграмы ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй да 2025 года».** Праграма ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва прадугледжвае ў сярэднетэрміновай перспектыве ўзаемныя пастаўкі прадукцыі ваеннага прызначэння ў інтарэсах сілавых структур Беларусі і Расіі, правядзенне навукова-даследчых, доследна-канструктарскіх работ па стварэнні новых і мадэрнізацыі існуючых узораў узбраення, правядзенне мерапрыемстваў адзінай палітыкі ў сферы тэхнічнага нармавання, стандартызацыі і каталагізацыі абароннай прадукцыі, сумесная рэалізацыя праектаў у інтарэсах трэціх краін, удзел у мерапрыемствах ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва, якія праводзяцца ў Беларусі і Расіі.

Таксама сенатарамі адобраны шэраг іншых законапраектаў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ЗА ДВУМА «ЗАЙЦАМІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Павышаны кантроль

У горадзе на Дзвіне ўзмацнілі кантроль за аплатай праезду ў грамадскім транспарце. У звычайным рэжыме работы па вобласці курсіруюць 18 кантралёраў: 9 — па Віцебску, 9 — па Оршы і Полацку. Акцыю, або, правільна сказаць, прафілактычнае мерапрыемства дзяржаўнае прадпрыемства «Аператар перавозак» праводзіць з мэтай павышэння ўзроўню адказнасці пасажыраў і выхавання іх да культуры паводзін у грамадскім транспарце. «Кантралёры выходзяць на лініі штодзённа, аднак цяпер з мэтай павышэння рэнтабельнасці некаторых маршрутаў і праверкі якасці аплаты праезду грамадзянамі па горадзе будуць працаваць 19 чалавек. Штраф за безбілетны праезд складае ад 0,5 да 1 базавай велічыні», — адзначыў **дырэктар ДП «Аператар перавозак» Аляксей ДОЎГІ.**

Кожны дзень толькі ў Віцебску на лініі выходзяць 400 адзінак транспарту: у іх ліку трамваі, тралейбусы, аўтобусы, маршрутныя таксі. Шукаць нядобрасумленных «зайцоў» кантралёры будуць, пачынаючы з 5 гадзін раніцы і да 12 ночы. Асаблівая ўвага — да ранішніх і вячэрніх гадзін пік.

## Пра асаблівасці прафесіі

На маршрут мы выходзім а чацвёртай гадзіне дня разам **з кантралёрамі Любоўю ВЕРАМЕЕНКАЙ** і **Інай ГАРБАЧОВАЙ.** За плячыма ў жанчын багаты стаж: чатыры і тры гады адпаведна толькі на прадпрыемстве, а да гэтага — доўгая біяграфія на пасадзе кандуктара. Сказаць, што прафесія кантралёраў салодкая — катайся сабе і правярай білецікі — значыць моцна памыліцца і пасля некалькіх гадзін працоўнага дня забраць свае словы назад.

Пры звычайным рэжыме работы яны працуюць пазменна: з 6 раніцы да 15.00, з 8 да 17.00, апошняя змена доўжыцца з 14.00 да 23.00. Сем-восем гадзін жанчыны (якіх у штаце пераважная большасць) знаходзяцца на нагах, балансуючы ў дрыжачых вагонах і салонах. І гэта, паверце, здаецца нічым у параўнанні са штодзённай камунікацыяй з людзьмі! Ад «зайцоў», якія ў 99 працэнтах выпадкаў даказваюць сваю невінаватасць, у бок кантралёраў сыплюцца не толькі нецэнзурныя словы, але і праклёны, а часам і ўдары. Але пра тое пазней.

Кантралёры сочаць не толькі за білетамі: пад іх агляд трапляюць афармленне прыпынкаў, наяўнасць у транспартным сродку паказальнікаў «уваход» і «выхад», інфармацыя аб кіроўцы і кандуктары, гукавыя аб'явы, нумар транспартнага сродку, наяўнасць выпіскі з правілаў перавозкі пасажыраў, схема маршруту. Тыя ці іншыя недахопы фіксуюцца прыладай відэазапісу і перадаюцца ў «Віцебскаблаўтатранс».

Заходзім у навенькі 12-ы тралейбус, які толькі што выехаў на маршрут. Адразу ў кандуктараў правяраем БУЛ — білетна-ўліковы ліст, дзе адзначаны час прыбыцця на канцавыя станцыі і нумары білетаў. Дарэчы, менавіта па апошніх лічбах на шэрым білеціку мае вопытныя калегі Любоў Уладзіміраўна і Іна Віктараўна адразу ўбачаць, калі «мухлюе» кандуктар. Такія выпадкі здараліся, але даўно, калі кандуктары прадавалі пасажырам пакінутыя або знойдзеныя білеты міма касы. Прахадзім па салоне — усё ў парадку.

У маршрутных таксі правяраюць больш кіроўцаў, чым пасажыраў, бо, як правіла, «прашмыгнуць» міма аплаты ў чалавека не атрымаецца. На білетах уважліва глядзяць на час, калі ён быў прабіты (каб не застаўся з мінулых рэйсаў), перавозчыка і цану. Але маршрутчыкі вызначаюцца асаблівай нелюбоўю да кантралюючых службаў.

Асаблівая ўвага аддаецца транспартным сродкам з бескандуктарнай сістэмай, дзе аплата праезду непасрэдна залежыць толькі ад сумлення грамадзянаў. Такі спосаб уведзены толькі ў некаторых трамваях 3-га і 6-га маршрутаў. У іх абавязкова павінны быць аб'явы аб тым, што білет трэба набыць у кіроўцы і пракампасціраваць, а таксама гукавое суправаджэнне. І, вядома, усе кампосцеры павінны быць у рабочым стане.

Пры выяўленні безбілетніка складаецца пастанова. Калі пасажыр згодны з парушэннем, яму выпісваюць штраф у памеры 0,5 базавай велічыні — 18,5 рубля на сённяшні дзень. Яго можна аплаціць на месцы ў кантралёраў або на працягу месяца ў банку, аднак за пратэрміноўку нават на адзін дзень зверху прыйдзецца дадаць яшчэ дзве базавыя. Вось і пракаціўся на адрэналіне! Калі пасажыр не згодны, яго выклікаюць у кантралюючы орган і прыцягваюць да адміністрацыйнай адказнасці, сума штрафу можа павялічыцца да адной базавай.




## Білетны веер і іншыя варыянты

Заходзім у шосты трамвай, ён якраз працуе без кандуктара. Праходзім па вагоне — і адразу дзве жанчыны трапілі ў рукі кантралёраў. Вядома, запрымеціць работнікаў цяжка — у іх адсутнічаюць сінія камізэлькі з салатавай паласой, выдаюць кантралёраў толькі бэйдж і прылада відэазапісу «Дазор». Дзве жанчыны працягнулі нам нешчаслівыя (як потым аказалася) білеты — адбітак трамвайнага кампосцера не супаў з тым, што быў на білеціку. Але віну сваю прызналі спакойна і выйшлі на прыпынку афармляць пастанову.

На чарзе «тройка», таксама з бескандуктарнай сістэмай аплаты. На гэты раз «зайцам» аказаўся мужчына пенсіённага ўзросту, які ехаў з работы дадому. Сітуацыя аднолькавая: дзірачкі на білеце ёсць, але не тыя. Запэўніўшы кантралёраў у тым, што ён прабіў білет на канкрэтным кампосцеры некалькі прыпынкаў таму, стаў чакаць. Фокус не атрымаўся, тады мужчына спакойна дастаў з кішэні цэлы веер білетаў з рознымі адбіткамі і пачаў шукаць патрэбны, параўноўваючы з арыгіналам. Я назіраю за гэтым, ледзь стрымліваючы смех, і разважаю сама сабе аб арыгінальным падыходзе да сітуацыі. У выніку штраф быў аплачаны на месцы.

«Такі спосаб «аплаты» — адзін з самых частых. Людзі, якія штодзень ездзяць па адным маршруце, збіраюць пракампасціраваныя білеты з розных вагонаў, бо ў кожным трамваі ўзор атрымліваецца розны. А потым падчас кантролю блытаюцца ў сваёй «калекцыі». Некаторыя з пасажыраў нават ручкай падпісваюць нумар вагона на білеце, каб выцягнуць патрэбны, і спадзяюцца на тое, што кантралёры не заўважаць. Некаторыя трымаюць новы білет напагатове і прабіваюць на нашых вачах, гэта таксама лічыцца безбілетным праездам», — расказвае Іна Гарбачова.

Віцебскіх кантралёраў моладзь ведае ў твар, а фота жанчын, зробленыя цішком, рассылаюць сярод сяброў у сацыяльных сетках з мэтай папярэджання. Тады безнаяўная сістэма «Аплаці» дазваляе за некалькі секундаў зрабіць аплату, пакуль кантралёры пройдуць праз салон, — «фішка» працуе безадмоўна. Калі людзі паказваюць праязныя, часта закрываюць пальцам тэрмін яго дзеяння. А некалькі гадоў таму былі распаўсюджаны падробленыя праязныя, аднак і іх вопытныя кантралёры выяўлялі. Любоў Уладзіміраўна ўспамінае, што зусім нядаўна ёй трапіўся пасажыр, які замест білета пракампасціраваў накрыўку ад пачка цыгарэт і з сур'ёзным тварам даказваў, што ён лічыць гэта аплатай.

## Мароз, міліцыя і зламаны нос

Калі разважаць аб цяжкасцях работы кантралёраў, то, акрамя фізічнай стомленасці, гэта цяжкі псіхалагічны прэсінг. Мужчыны-безбілетнікі сыплюць на работніц адборныя мацюкі, жанчыны шлюць праклёны. Звыкнуцца з такой камунікацыяй і абстрагавацца ўдаецца нямногім, таму працуюць тут сапраўды загартаваныя людзі. Адна з маіх суразмоўніц успамінае, што ў яе бытнасць кандуктарам кіем па галаве яе моцна ўдарыла пажылая жанчына. Гэта адна з самых запамінальных гісторый, калі не лічыць шматлікіх штуршкоў.

Вяртаемся да асаблівай нелюбові кіроўцаў маршрутных таксі да кантралюючых органаў: на прадпрыемстве здарыліся два рэзанансныя выпадкі, калі чарговая праверка скончылася цялеснымі пашкоджаннямі. У адным маршрутчык галавой ударыў мужчыну-кантралёра ў твар, зламаўшы нос. У другім — жанчына толькі падышла да адчыненых дзвярэй маршруткі і ўхапілася за ручку, як кіроўца пачаў рух, працягнуўшы кантралёра па асфальце. Такія сітуацыі і патрабуюць выходзіць на змену парамі ў мэтах бяспекі.

Пастановы «зайцам» выпісваюць, як правіла, на прыпынку, дзе няма камфортных умоў. Да гэтага яшчэ дададзім вецер, дождж або гарачыню. Любоў і Іна ўспамінаюць, як неаднойчы на лютым марозе выпісвалі штраф задубелымі рукамі. А раніцай узімку, калі на вуліцы яшчэ цёмна, прыходзіцца карыстацца персанальнымі ліхтарыкамі. Самае цікавае, што раней штраф выпісвалі толькі па імені і прозвішчы, а цяпер — толькі пры наяўнасці пашпарта. Калі ў чалавека адсутнічае дакумент — кантралёры выклікаюць нарад міліцыі, які ўстанаўлівае асобу грамадзяніна. Тады працэдура на прыпынку расцягваецца на гадзіну і даўжэй у любое надвор'е, у некаторых выпадках кантралёры разам з безбілетнікам едуць у аддзел міліцыі.

## У завяршэнне

Мэты выпісаць як мага больш штрафаў у кантралёраў няма, як і плана выканання дадзенай працэдуры. Галоўнае — вярнуць пасажыраў да культуры аплаты праезду як абавязку. На жаль, нашы грамадзяне забываюць, што аплаціць праезд, як і пакупку ў магазіне, — гэта дзеянне, якое ў першую чаргу павінна быць у інтарэсах самога чалавека. А рэгулярныя прафілактычныя акцыі стануць яшчэ адным крокам на шляху да абуджэння сумлення кожнага.

***Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,***
***фота аўтара.***

Па сутнасці



# Суботнік Памяці

Радасць і багацце. Кажуць, гэта не заўжды сумяшчальна. Паслухаць дзядуляў ці бабуль, альбо нават бацькоў. Час іх маладосці быў не вельмі прыдатны для камфорту. Працавалі шмат і цяжка, а вось ласавацца даводзілася толькі ў вялікія святы. Але ў касавіцу, падчас жніва, на полі ці на таку заўжды гучалі песні. Пасля кожнага гарачага дня, цяжка адпрацаваўшы ад відна да відна, моладзь, нібы птушкі, зляталася на вечарыны. А былі святы, калі і дарослыя не саступалі маладым. Весяліліся. Бо ўмелі сумяшчаць працу з адпачынкам. Працавалі рупліва, святкавалі гулліва і на ўсё час мелі.

Цяпер час спраў. Добрых учынкаў. Асабліва калектыўных. Час суботніка. Назва савецкая. Сэнс — больш глыбокі. Я некалі здзіўляўся: як гэта раней, без сучасных тэхналогій і інструментаў, хаты, нібы грыбы пасля цёплага дажджу, раслі? Бо будавалі талакой. А сёння тая традыцыя трансфармавалася ў рэспубліканскую талаку. Калі агульную нашу хату прыбіраем разам, калі ствараем новыя праекты.

Цяпер час выклікаў. Трэба адстаяць сваю перамогу. Насуперак заходняму мейнстрыму. Нічога. Мы звыкліся. Яны там зносяць помнікі нашым продкам, тым, хто выратаваў іх ад смерці і знішчэння. Такая вось падзяка. Мэта — вынішчыць з памяці палякаў ды чэхаў праўду аб салдацевызваліцелю. Мала таго што на прасторах уплыву НАТА, здаецца, нібы паўночнаатлантычная ружа вятроў, спрабуе выдзьмуць пераможную памяць і з нашых земляў. Яны сваімі бруднымі кіпцюрамі ўпіліся ў наша мінулае. Каб вырваць пераможны ген у нашага народа. Асабліва ў моладзі. Як нам адказаць? Мірнай добрай справай. Агульнарэспубліканскай талакой. Шанаваць створанае можна навучыць толькі праз працу. Ніколі чалавек не будзе разбураць ім жа зробленае. Таму вельмі мудры падыход. Гэты суботнік — дзеля збережэння гісторыі. Усёй краінай падчас суботнікаў мы зараблялі грошы на будаўніцтва дзіцячых садкоў, лядовых палацаў — яны прывязаныя геаграфічна. Грошы ад талакі выдаткавалі і на Нацыянальную бібліятэку. Гэта так прыемна — нібы сад пасадзіць. Бібліятэка — сад ведаў.

Цяпер жа мы разам будзем ствараць і ўмацоўваць памяць — сродкі ад суботніка сёлета будуць пералічаны менавіта на гэта. Будзем працаваць на будаўнічых пляцоўках, наводзіць парадак у сваіх населеных пунктах або проста займацца сваёй справай на рабочым месцы. З высакароднай мэтай — зберагчы гісторыю, захаваць памяць аб продках-пераможцах і аб тых, хто аддаў жыцці ў той страшнай вайне.

Кожны, хто не абыякавы да подзвігаў сваіх продкаў, павінен унесці сваю маленечкую лепту. Нашы продкі — франтавікі і партызаны, працаўнікі тылу альбо вязні еўрапейскай гуманнасці. Тыя, хто выжыў і хто не дажыў да міру. Гэта ў іх гонар мы адкажам па-беларуску на ўсе вынікі той жудаснай вайны. Па-беларуску — значыць мірнай працай.

Звычайна два мільёны беларусаў бяруць удзел у суботніках. Кожны чацвёрты — дзеля памяці кожнага трэцяга. Летась сродкі пайшлі на рэстаўрацыю «Хатыні». Кожны цяпер можа прыехаць і сказаць: тут і мая капейка, у гэтым бясцэнным праекце памяці. Каб камяні не заімшэлі, а яшчэ больш важна — каб душы не акамянелі.

Пра душы — гэта не пра беларусаў. Не пра сапраўдных суайчыннікаў. Але пра тых, хто гарлапаніць пра свае абранасць і неверагоднасць. Яны і цяпер усчынаюць крык — аб непатрэбнасці талакі, аб немэтазгоднасці, аб тым, куды ідуць грошы ад суботніка. Вы лепш палічыце, колькі плацяць вашым «лідаркам» і «гульцам» у палітыку. І за што такія грошы?

Якая б ні была справа — яны яе намагаюцца паганіць. Прынесці ў ахвяру сваім заморскім ідалам. А калі гэта справа, што гуртуе нарад, калі дзея тая — мудры адказ на выклікі часу, — вэрхал будзе стаяць ці не на ўсю Еўропу...

Сёлета суботнік супадае з часам памінання продкаў — дзесьці робяць на Радаўніцу, дзесьці — напярэдадні ў нядзелю або яшчэ раней — у чацвер. Гэта мясцовыя асаблівасці. Галоўнае — беларусы знітаваныя моцнай сувяззю з родам і зямлёй, з бацькамі і бацькаўшчынай. І ў гэтым наша сіла.

За кошт сродкаў, заробленых на сёлетнім суботніку, будзе рэканструяваны мемарыял «Азарычы» і створаны цэнтр патрыятычнага выхавання моладзі ў Брэсцкай крэпасці. Зусім невялікі рахунак за мінулае і інвесціцыі ў будучыню. Удзячная магчымасць працаваць на сябе, проста жыць і гадаваць дзяцей на мірнай зямлі.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні родным і блізкім дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, намесніку Адказнага сакратара — начальніку Апарату Прадстаўніцтва Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі ў Рэспубліцы Беларусь Дзмітрыю Дзмітрыевічу Гобараву ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# Гамбіт па-сухарэўску



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Мы, жыхары вёсак Сухары, Харошкі, Зарэсце Сухарэўскага сельсавета звяртаемся з просьбай аб аднаўленні нашай гаспадаркі ТАА «Сухары Агра». Гэта наша жыццё. Мы падтрымліваем пазіцыю наконт таго, што калі знішчым вёску, загубім краіну. Юрыдычна прадпрыемства яшчэ ёсць, а фактычна ўсе рахункі заблакіраваны. Інвестар, ён жа і заснавальнік, ТАА «МагілёўПрадукт», купіў гаспадарку на ўмовах захаваць яе вытворчасць і як мінімум 30 працоўных месяцаў. Але ў выніку за працягу трох дзён 1337 галоў БРЖ (буйной рагатай жывёлы) было вывезена, а 78 асноўных работнікаў вымушаны ездзіць на работу ў Магілёў, вёску Грыбаны, аграгарадок Раманавічы. Цяпер працягваецца вываз тэхнікі, кінуты няздрэнныя жывёлагадоўчыя памяшканні з сучасным дальнім абсталяваннем у аграгарадку Сухары, вёсках Харошкі, Малое Бушкава, Ходнева, а таксама збожжаток, збожжасклады, мехдвор і г. д.» Гэта — сцісілы варыянт калектыўнага ліста на дзявюх старонках.

Днямі ў Сухарах з такой нагоды адбыўся сход з удзелам усіх зацікаўленых. Але пытанні засталіся. Газета не прэтэндуе на ролю апошняй інстанцыі, мы толькі далі магчымасць выказацца абодвум бакам.

## «Хочам, каб вёска жыла»

З аўтарамі звароту **Мікалаем ВАЛЮЖЭНІЧАМ, Васілём КОТАВЫМ і Леанідам БАРСУКОВЫМ** сустракаемся на тэрыторыі Сухарэўскага сельсавета. Усе яны — былыя работнікі гаспадаркі, займалі не апошнія пасады, карыстаюцца аўтарытэтам у сваіх землякоў. Той жа Мікалай Валюжэніч у свой час быў галоўным аграномам тады яшчэ калгаса «Камуністычны маніфест», пэўны час працаваў старшынёй Сухарэўскага сельсавета.

Ён расказвае, што праблемы пачаліся з 2012 года пасля акцыянавання СВК і далучэння яго да агракамбіната «Прыдняпроўскі», які ўжо на той момант быў закрэдытаваны. На руках суразмоўніка — вынікі асноўных эканамічных паказчыкаў з 2012 да 2018-га. Мяркуючы па іх, яшчэ пяць гадоў гаспадарка дэманстравала рэнтабельнасць больш за 7 %.

— «Прыдняпроўская» птушкафабрыка ў выніку закрэдытавала і нашу гаспадарку, — канстатуе Мікалай Дзмітрыевіч. — Сёння няўзброеным вокам відаць, што яна ледзь дыхае. Дзяржава будавала аграгарадок, укладвала грошы, а цяпер гэта ўсё можа згаснуць. Людзям трэба шукаць работу дзесьці на баку, рана ўставаць, ісці на прыпынак, ехаць за дзясяткі кіламетраў працаваць, позна вяртацца. Яшчэ адзін аўтобус



вязе нашых людзей у ААТ «Магілёўскі лянок», да якога таксама не адзін дзясятак кіламетраў. Людзей да сямі раніцы забралі, пасля 18.00 прывезлі, а калі жыць? Калі сваёй гаспадаркай займацца, дзецьмі?

Аўтары звароту перажываюць, што працэсы перабудовы сталі адбівацца і на аграгарадку. Апошнія дамы для спецыялістаў узводзіліся тут у 2007 годзе, а новыя гаспадары пра развіццё населенага пункта нават гаворкі не вядуць.

Васіль Васілевіч, былы галоўны ветурач гаспадаркі, наракае, што з населенага пункта з'язджаюць шматдзетныя сем'і. Іх дзеці растуць на асфальце і да зямлі жадання вяртацца не маюць...

— Душа баліць за гэту гаспадарку, — з горыччу кажуць ветэраны працы. — Калі гаспадарка была, людзі хадзілі на работу, з работы, на абед, з абеду. Жыццё кіпела. Цяпер — пустэча. Летам яшчэ дачнікі прыязджаюць, а зімой ідзеш па цэнтральнай вуліцы — і цішыня. Як на могілках.

— Вось нас на сход сабралі і супакойваюць, што ўсё добра, усе пры рабоце, — уздыхае Мікалай Валюжэніч. — Але мы жадаем, каб работа была ў нас, а не дзесьці ў Раманавічах. Столькі памяшканняў засталося — фермы, дальныя залы... Хай там будуць свінні, каровы, нават птушкі — толькі б людзей ад нас нікуды не звозілі. Каб Сухары жылі, каб дамы будаваліся, дзеці ў садок і школу хадзілі. А раслінаводства, якім яны тут плануюць займацца, гэта не вытворчасць. Для пастаяннага абслугоўвання тут людзі не патрэбныя. А мы хочам, каб вёска жыла. Цаліну ўзнімалі і будавалі, сёння наша цаліна — беларуская вёска...

## «Хочам, каб гаспадарка працавала рэнтабельна»

Новы этап жыцця ў ТАА «Сухары Агра» пачаўся з мінулага года, калі таварыства з абмежаванай адказнасцю «МагілёўПрадукт» купіла кантрольны пакет акцый згаданай арганізацыі і птушкафабрыкі ў Раманавічах. Абодва суб'екты гаспадарання ўваходзілі калісьці ў склад агракамбіната «Прыдняпроўскі», пасля банкруцтва якога атрымалі статус асобных юрыдычных асоб і пэўны час чакалі інвестараў. Маладое прыватнае прадпрыемства, якое іх купіла, спецыялізуецца на аптовым гандлі прадуктамі харчавання і сельгаспрадукцыі, а таксама займаецца развіццём птушкагадоўлі і раслінаводствам. На момант продажу ТАА «Сухары Агра» тут працавала каля 50 чалавек і ўтрымлівалася больш за 1300 галоў буйной рагатай жывёлы.

— Летась, калі інвестар набываў птушкафабрыку ў Раманавічах, была ўмова забраць і «Сухары Агра», — расказвае **дырэктар ТАА «Сухары Агра» Аляксандр СЕМЯНКОЎ.** — Абедзве гаспадаркі былі выстаўлены на продаж. Калі б птушкафабрыку не купілі, яна б распрадавалася па частках — зямля, памяшканні. Што датычыцца «Сухары Агра», то яно не мела прыбытку, а памер яго доўгу на сённяшні дзень складае мільён рублёў. Тэхніка патрабавала рамонту, жывёла — кармоў, мы і тое, і другое забяспечылі. Для жывёлы куплялі камбікармы, сянаж, сілас. Адкармілі да 580—680 кілаграмаў і перадалі агракамбінату «Усход». Гэтая перадача юрыдычна афармленая і ўзгодненая з мясцовымі ўладамі. Калі жывёла выбыла, работнікам прапанавалі работу на птушкафабрыцы ў Раманавічах. Некаторыя пажадалі працаўладкавацца ў суседніх гаспадарках, нехта паехаў у горад працаваць. Але большасць пагадзілася ездзіць на работу ў Раманавічы. Аўтобус забірае людзей з Зарэсця, Сухароў і праз Магілёў вязе да работы. Зарплата там у 1,5 раза вышэйшая, завозяць, прывозяць — што яшчэ трэба? Работнікам, якім заставалася да пенсіі некалькі месяцаў, афармлялі пенсіі, выдавалі дапамогу. Усе задаволеныя.

Суразмоўнік сцвярджае, што перспектыў у гаспадаркі наогул не было. Яна ўпэўнена ішла на дно.

— «Энерганагляд» папярэдзіў, што ферма ў Сухарах старая і небяспечная для людзей — адсутнічаў зазямляючы контур, — прыводзіць ён аргумент. — На гэта ёсць судовае прадпісанне. Каб зрабіць зазямленне, трэба было спачатку заказаць праектную дакументацыю, якая каштуе прыкладна 20-30 тысяч рублёў, а потым праводзіць усе неабходныя работы, якія занялі б не адзін месяц. Не лепшая сітуацыя па фермах у Ходневе і Харошках, якія былі закрытыя яшчэ да продажу таварыства. Працавалі толькі ў Малым Бушкаве, дзе «Дзяржплемпрадпрыемства» арандуе плошчы, і да нядаўняга часу тут — у Сухарах. Што датычыцца астатніх пабудоў, то калі яны будуць або выкарыстоўвацца, або здавацца ў арэнду. Інвестар не зацікаўлены, каб плошчы пуставалі. Цяпер на мехдвары ў Сухарах некалькі камбайнаў і трактароў, астатняя перагналі ў Раманавічы на рамонт.

Што чакае гаспадарку ў перспектыве? Аляксандр Семянкоў тлумачыць, што будзе развівацца раслінаводства. Да канца года плануецца таксама пашырыць дзейнасць птушніка ў найбліжэйшых да Сухароў Кісяльках. І там будуць створаны дадатковыя працоўныя месцы. Ці вернецца калі-небудзь жывёлагадоўля ў Сухары, суразмоўнік пакуль не загадвае. Але калі і вернецца, яе трэба будзе арганізоўваць з нуля. Бо ў тым выглядзе, якая ферма цяпер, яе нельга выкарыстоўваць. І рэканструяваць бессэнсоўна. Перспектывы залежаць ад фінансаў.

## Сцэнарый для вёскі

На тэрыторыі сельсавета сёння зарэгістраваны 841 чалавек, 500 з іх жывуць непасрэдна ў Сухарах. Яшчэ да набыцця інвестарам гаспадаркі тут было на ўліку 48 не прызнаных занятымі ў эканоміцы людзей. І, як сцвярджае **выконваючы абавязкі старшыні Сухарэўскага сельсавета Аляксандр ЗІНЬКЕВІЧ,** іх больш не стала.

— Калі ў тутэйшых узніклі пытанні з працаўладкаваннем, мы пачалі супрацоўнічаць з кіраўніцтвам птушкафабрыкі ў Раманавічах, адкрытага акцыянернага таварыства «Магілёўскі лянок», аграфірмы «Кадзіна», — расказвае ён. — Хто хоча працаваць, праца. Вядома, раней больш зручна было, але ж узнікла вось такая сітуацыя. На сёння пытанняў з працаўладкаваннем былых супрацоўнікаў гаспадаркі няма. Існуе падвоз людзей да месца работы і дамоў. Вядома, свая гаспадарка — лепш. Але добра ўжо тое, што яна не знікла, зямля апрацоўваецца, Раманавічы тэхнікай падтрымліваюць. Жыццё працягваецца.

Аднак тутэйшых чамусьці ўсё гэта не супакойвае. Мікалай Валюжэніч запрашае на экскурсію па Сухарах. Ён — аматар-краязнавец і можа гадзінамі расказваць пра Сухары.

Аграгарадок сапраўды прывабны для жыцця. Чысты раён, рэчка, возера ў восем гектараў, лес з грыбамі ды ягадамі, дарожная сетка — жыві і радуйся. На вуліцы Маладзёжнай двухпавярховікі, пабудаваныя па чарнобыльскай праграме, — сюды пасля аварыі прыехалі перасяленцы. Яны і сёння не пустуюць. На участках каля дамоў завіхаюцца людзі, са школы ідуць дзеці. Школа таксама двухпавярховая, дагледжаная. Сёння тут вучыцца, па словах майго гіда, 70 дзяцей. Яшчэ 20 наведваюць дзіцячы садок, які функцыянуе асобна. Чыста, прыгожа, дагледжана. У невялічкім парку стаяць трэнажоры для заняткаў спортам. Працуе некалькі крамаў, ёсць клуб, амбулаторыя, ФАП, аптэка, прыгожы храм XIX стагоддзя. Ферма, з-за якой перажываюць ветэраны гаспадаркі ў Сухарах, на ўскрайку населенага пункта. Звонку сапраўды выглядае прыстойна. Але прыкметы запусцення ўжо відаць...

Зрэшты, галоўнае, каб гэты пусты будынак не стаў пачаткам апусцення самой вёскі. Будзем спадзявацца, што інтарэсы яе жыхароў і людзей, якія прыйшлі сюды як гаспадары, усё ж супадуць у пэўным яшчэ не крытычным пункце.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара,**
*Магілёўскі раён.*

### Кампетэнтны каментарый

**Генадзь ДАВЫДАЎ, першы намеснік начальніка ўпраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні Магілёўскага райвыканкама:**

— Наконт інвестараў, якія прыйшлі, скажу, што гэта людзі талковыя, дзелавітыя, у іх ёсць планы, яны ведаюць, чаго хочуць, і ідуць да сваёй мэты. На сённяшні дзень зямля ўжо прыгледжана. Аднавіць тыя пабудовы, што існуюць у ТАА «Сухары Агра», сёння даражэй, чым пабудаваць новыя. Сэнсу няма ўкладаць туды такія грошы. Работу ўсім прапанавалі. Дарэчы, з пяці механізатараў, якія там працавалі, толькі ў аднаго былі правы на кіраванне тэхнікай. Аўтары звароту ўзнімаюць пытанне, што трэба будаваць дамы, тады людзі вернуцца ў калгас. Але гэта не так. Шмат прыкладаў, калі новыя дамы ёсць, а працуюць у гаспадарцы лічаныя людзі. Нядаўна размаўляў з выпускнікамі школ раёна, і толькі адзін хлопец сказаў, што будзе паступаць у сельскагаспадарчую ВНУ. А без моладзі вёска — не вёска. Вось праблема, над якой трэба працаваць.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Каля 85 працэнтаў насельніцтва Афганістана жыве за мяжой беднасці

Гэта вынікае з даклада «Сацыяльна-эканамічныя перспектывы Афганістана на 2023 год», апублікаванага Праграмай развіцця ААН (ПРААН). «Адразу ж пасля іх прыходу да ўлады (рух «Талібан». — **«Зв.»**) афганская эканоміка, якая на працягу апошняга дзесяцігоддзя скочвалася ў галечу, абвалілася. З насельніцтвам каля 40 мільёнаў чалавек і ВУП у $14,3 мільярда ў 2021-м Афганістан уваходзіць у лік краін з самым нізкім даходам на душу насельніцтва ў свеце, а каля 85 % насельніцтва, паводле ацэнак, жыве за мяжой беднасці», — адзначаецца ў дакладзе. Пачынаючы са жніўня 2021-га ВУП Афганістана зніжаецца, і краіна трымаецца толькі на гуманітарнай дапамозе з іншых краін. Змяншэнне дапамогі на 30 % прывядзе да таго, што Афганістан стане найбяднейшай краінай, у горшым становішчы, чым Сірыя, Судан і іншыя, а яго ВУП вернецца да адмоўнага росту.

### Пераход авіяцыі ЕС да вугляроднай нейтральнасці абыдзецца амаль у $900 млрд

Пераход еўрапейскай авіяцыі да вугляроднай нейтральнасці, які плануецца ажыццявіць да 2050-га, будзе каштаваць Еўрасаюзу каля $900 млрд. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на даклад Destination 2050. Згодна з дакладам, найбольшыя расходы будуць звязаныя з набыццём для самалётаў экалагічна чыстага авіяпаліва, якое складаецца з жывёльнага тлушчу і бытавых адходаў. На гэта спатрэбіцца каля $480 млрд. Плануецца, што да 2050-га доля такога паліва ўзрасце з 6 да 83 працэнтаў, што дасць магчымасць знізіць шкодныя выкіды ў атмасферу на 70 %. Акрамя таго, чакаецца, што да 2035 года ў Еўропе з'явяцца вузкафюзеляжныя самалёты на вадароднай цязе. Іх выкарыстанне дапаможа зменшыць выкіды ў атмасферу вуглякіслага газу на 60 % у параўнанні з сучаснымі самалётамі.

### У Швейцарыі з аўкцыёну за $5,3 млн долараў прададзены шкілет дыназаўра



У Цюрыху прайшоў унікальны аўкцыён: на продаж — усяго трэці раз у гісторыі — быў выстаўлены поўны шкілет тыраназаўра. Новым уладальнікам дыназаўра па мянушцы Трыніці стаў невядомы пакупнік, «прыватны калекцыянер з Еўропы», які выклаў за косці 4,75 мільёна швейцарскіх франкаў (каля 5,3 млн долараў). Вышыня шкілета — каля 4 метраў, даўжыня — 11,6 метра, так што нават у спакаваным выглядзе ён займае дзевяць скрынь вельмі вялікага памеру. Менавіта ў такім выглядзе Трыніці была выстаўлена на таргі, праведзеныя аўкцыённым домам Koller. Зрэшты, вялізны чэрап дыназаўра на час правядзення аўкцыёну дасталі: ён знаходзіўся каля падножжа подыума аўкцыяніста. У каталогу лот значыўся пад імем TRX-293. У абрэвіятуры лёгка ўгадваецца назва жахлівага яшчара, а 293 — лік касцей, з якіх складзены шкілет Трыніці.

# МАЕ 17 ІМГНЕННЯЎ ВЯСНЫ



*З прыходам вясны я згадала, што летась хацела зварыць варэнне з сасновых шышак. Але так і не дабралася. Не памятаю, ці то настрою не было, ці то часу. Хоць, калі быць шчырай з сабой, справа не ў гэтым. Чамусьці на тое, што ТРЭБА, час ёсць заўсёды, і ніякі настрой не з'яўляецца перашкодай. А вось простыя імгненныя жаданні, якія ідуць ад сэрца, адкладваю бясконца...*

*Днямі сяброўка запрасіла мяне ў тэатр. Спачатку прынеслася думка, што пятніца перад Вялікаднем для гэтага — не вельмі зручны дзень. Прыйдзецца застаца начаваць у Мінску. А мне ж ТРЭБА рыхтавацца да свята: пячы кулічы ды фарбаваць яйкі. Прычыны, каб кудысьці не пайсці, самі разумееце, заўсёды знойдуцца. Але Таня напісала: «Я спачатку думала пайсці на спектакль адна, але згадала, што ты хацела раз на месяц хадзіць, а не ходзіш». (Сапраўды, у лютым я была ў РТБД на «Пачупках» і так натхнілася, што загарэлася паглядзець за год як мінімум 12 спектакляў.) Пасля гэтых слоў я, канешне, пагадзілася і ніколькі не шкадую. Падчас спектакля мы і плакалі, і смяяліся. А потым ішлі да метро пад дажджом і дзяліліся ўражаннямі.*

*Дык вось, калі б я тады ў лютым не падзялілася з сябрамі сваімі планамі пра наведванне тэатра, думаю, Таня пайшла б на спектакль у тую пятніцу адна. Менавіта гэты факт і натхніў мяне на тое, каб скласці спіс прыемных спраў, якія я адкладваю не адну вясну. Ідэю яшчэ летась падгледзела ў прыяцелькі, вялікай аматаркі кіно. Іра ўжо некалькі гадоў запар змяшчае свае вясновыя жаданні пад хэштэгам «17 імгненняў вясны» на сваёй старонцы ў сацсетках. Кажа, што калі б не гэты спіс маленькіх радасцяў, яна большую частку з іх наўрад ці ажыццявіла б. Таму і я, каб не было спакусы зноў штосьці адкласці, вырашыла падзяліцца сваімі планамі на гэту вясну з вамі.*

*Такім чынам, мне трэба:*

*Схадзіць у маі ў РТБД на «Калеку з вострава Інішман».*

*Наведаць Батанічны сад падчас цвіцення бэзу. Гэты паход я адкладаю з 30 мая 2015 года. Менавіта ў гэты дзень мы з Уладзем стварылі сям'ю і пасля роспісу паехалі ў Батанічны сад. Думала, штогод на гадавіну вяселля будзем хадзіць туды з мужам. Але неяк не склалася...*

*Часцей усміхацца, у тым ліку сумным мінакам на вуліцах Мінска.*

*Прачытаць яшчэ як мінімум адну цікавую кнігу. Ужо праглынула тры часткі «Атлант расправіў плечы» Айн Рэнд. Днямі ўзяла ў бібліятэцы па парадзе прыяцелькі раман Яўгена Вадалазкіна «Лаўр». Дарэчы, усім раю запісацца ў бібліятэку. Гэта не толькі дапамагае сэканоміць грошы, але і вельмі дысцыплінуе.*

*Зварыць варэнне з сасновых шышак.*

*Адправіцца з сябрамі ў лес збіраць смарчкі.*

*Пакінуць сына з мужам і выбраца адной на вячаровую прагулку ці прабежку да лесу. Каб хаця б 30 хвілін пабыць сам-насам, са сваімі думкамі.*

*Запісацца на масаж.*

*Есці пабольш зеляніны, гародніны, садавіны. І піць пабольш вады.*

*Пабегаць з сынам у гумовых ботах па лужах падчас дажджу.*

*Набыць і запусціць паветранага цмока.*

*Зладзіць сямейную вандроўку па Віцебшчыне, перад гэтым склаўшы цікавы маршрут месцаў, дзе мы яшчэ не былі.*

*Навучыцца пячы салодкія і несалодкія венскія вафлі, бо падораная вафельніца ўжо даўно ляжыць без справы.*

*Зрабіць сюрпрыз дарагому чалавеку без нагоды, калі ён (ці яна) менш за ўсё гэтага чакае. Наогул, зламіла сябе на думцы, што клопат пра іншых людзей асабіста мне прыносіць процьму станоўчай энергіі.*

*Паспрабаваць штосьці новае, чаго дагэтуль не спрабавала.*

*Паехаць на лыжа-ролерную трасу і пакатацца на роліках, якія апошнія некалькі гадоў пыляцца на паліцы.*

*Штодзень заўважаць, як прырода прачынаецца пасля зімы, як раннія крокусы ды прымулы змяняюцца на нарцысы ды цюльпаны. Рабіць перапынкі паміж бясконцымі «ТРЭБА», час ад часу сыходзіць, як паравозік з Рамашкава, з наезджаных рэек і любавацца ландышамі, слухаць песні салаўя, прачынацца з сонцам і сустракаць світанкі. І ўсё гэта — каб не спазніцца на ўсю вясну.*

*Магчыма, хтосьці з вас таксама натхніцца і складзе свае 17 імгненняў вясны. Наперадзе ж яшчэ цэлы май! Неабавязкова агучваць жаданні, як я, публічна. Можна павесіць свой спіс на халадзільнік, каб проста быў навідавоку. Бо недарэмна кажуць, што думкі матэрыяльныя. А запісаныя дык удвая. Давайце разам напаўняцца маленькімі простымі радасцямі. І памятаць, што кожны новы дзень — гэта маленькае жыццё.*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**


Сямейная газета

Выпуск № 7 (210)


Тыя, хто побач

# Мама на трэніроўцы, тата ў дэкрэце.

## Як жыве чэмпіёнская сям'я

**Прыйшоў, убачыў, перамог — кар'ера Артура Літвінчука ў трох словах. Пакуль іншыя весляры пачыналі раскрываць свой спартыўны патэнцыял, ён стаяў на найвышэйшай прыступцы п'едэстала Алімпійскіх гульняў 2008 года. У складзе каманды байдаркі-чацвёркі разам з Раманам Петрушэнкам, Вадзімам Махневым і Аляксеем Абалмасавым яны перамаглі на дыстанцыі ў тысячу метраў. Артуру Літвінчуку было 20 гадоў, на грудзях свяцілася алімпійскае «золата». Тое, што яшчэ нядаўна здавалася немагчымым, стала рэальнасцю. Ён сапраўды прыйшоў (правільней будзе сказаць, уварваўся) у эліту сусветнага веславання, убачыў, як ідуць справы, і перамог разам са сваімі таварышамі. Перамог на Алімпійскіх гульнях, затым на чэмпіянаце свету і на чэмпіянаце Еўропы. Наколькі хутка экіпаж пераадолеў дыстанцыі на галоўных стартах, настолькі імклівай аказалася і спартыўная кар'ера Артура Літвінчука. Але гэтае прозвішча ў гісторыі сусветнага веславання не згубілася. Сёння яго актыўна ўслаўляе жонка чэмпіёна — Марына Літвінчук.**


***(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)***




Кропка на сэрцы

# «ХАЧУ ДАДОМУ. І КАБ МАМА ПАПРАВІЛАСЯ...»

**Ёсць журналісцкія заданні, падчас выканання якіх на вочы наварочваюцца слёзы. Гэта — з іх ліку. У прытулку, які я наведала днямі, дзеткам створаны ўсе ўмовы для камфортнага жыцця. Чыстая пасцельная бялізна, прыгожае адзенне, смачная і цёплая ежа, шмат цацак у гульнявым пакоі, сучасны камп'ютарны клас... Але, калі прыглядаешся, у вачах хлопчыкаў і дзяўчынак, якія знаходзяцца паміж домам і дзіцячым домам, чытаюцца непадробныя сум і роспач... Трапілі яны сюды не ад добрага жыцця. Тым не менш, як гэта ні парадаксальна, усе хочуць да мамы, якая б яна ні была...**

## Калі бацькі «накасячылі»

Прыехала я ў Сацыяльна-педагагічны цэнтр Маскоўскага раёна Мінска ў другой палове дня. Якраз у гэты час старэйшыя дзеці вярнуліся са школы і разам з выхавацелькай клеілі калажы на тэму здаровага ладу жыцця. Дашкольнікі ж паверхам ніжэй будавалі вежы з кубікаў ды складалі пазлы. На момант майго прыходу ў прытулку знаходзілася 18 хлопчыкаў і дзяўчынак. Усіх іх аб'ядноўвае цяжкая псіхічная траўма, нанесеная самымі блізкімі людзьмі на свеце...

— Вось Ніна ў нас даўжэй за ўсіх тут. Дамоў, напэўна, хочаш? — пытаецца **Таццяна Пятроўна ІЗОТАВА, дырэктар установы і дзяржаўны апякун.**

— Не, — матляе галавой дзесяцікласніца. — Я тут засталася б назаўсёды.

— Ну, тады табе трэба закончыць педуніверсітэт і прыйсці сюды працаваць.

— Па льготах яна праходзіць у педклас, — уступае ў размову выхавацелька. — Усё рэальна, было б жаданне.

— А вось гэта Макар, ён літаральна тыдзень у нас. Як ты адаптаваўся, нармальна? (Дзевяцікласнік ківае галавой.) Раскажы, чаму ты тут?

— «Накасячылі» бацькі...

— Мама яшчэ не прыходзіла?..

— Пакуль не. Ну, у яе ж работа. Яна да 21.00 працуе...

Ужо потым, калі мы выйшлі з класа, дырэктар прытулка распавяла мне ва ўсіх падрабязнасцях гісторыі сваіх выхаванцаў. Вось у Макара, напрыклад, ёсць яшчэ малодшыя брацік і сястрычка. Іх мама ўжо аднойчы пазбаўлялася бацькоўскіх правоў. Дзеці былі ў бабулі на апецы. Потым маці аднавілася ў правах, і брацікі з сястрычкай вярнуліся дадому. Але неўзабаве жанчына зноў запіла-загуляла... Дзеці чарговы раз апынуліся ў прытулку...

— Не ад добрага жыцця яны тут. Але да апошняга апраўдваюць сваіх бацькоў. Калі да іх, каб праверыць умовы пражывання, прыходзяць настаўнікі са школы, могуць сказаць, што мамы дома няма, яна выйшла ў краму па прадукты. Ці ў яе ўкралі кашалёк, таму цяпер няма грошай на рамонт. Многія дзеці пераносяць віну на сябе. Маўляў, я прапускаў урокі, дрэнна вучыўся, таму настаўнікі сталі хадзіць да мамы. Гэта я вінаваты, што яе пакаралі, што мяне адабралі... У нашых выхаванцаў шмат праблем, у тым ліку і з самаацэнкай, таму з дзецьмі з першых дзён працуе педагог-псіхолаг.

Нявызначанасць — самае цяжкае для іх. Вось Ніна, напрыклад, паўгода таму трапіла ў прытулак разам са сваімі дзвюма сястрычкамі. Іх мама двойчы выходзіла замуж, таму ў дзяўчынак розныя таты. Літаральна днямі быў суд. Маму, якая злоўжывае алкаголем, пазбавілі бацькоўскіх правоў. Айчым Ніны сваіх дачок адразу забраў да сябе. Ніна да апошняга спадзявалася, што ён і яе забярэ разам з сястрычкамі. У судзе яна сказала, што, паколькі яе мара не ажыццявілася, хацела б, каб яе таксама забраў родны тата. Той жыве ў вёсцы разам са сваёй маці і старэйшай дачкой. На першым судовым пасяджэнні мужчына сказаў, што забярэ Ніну. Але ўжо на другім пасяджэнні пры ўсіх заявіў, што не гатовы. Самае цікавае, што пасля суда гэты тата падышоў да дачкі, як быццам нічога ніякага, абняў яе і сказаў: «Ну, бывай, Нінуся». Такое адчуванне, што ён нават не разумеў, што ў гэты момант рабілася ў душы дзіцяці ад такіх паводзін дарослых. Дзяўчынка адчувае сябе наогул нікому непатрэбнай...


***(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)***

Добрая справа

# УКОЛ ЖЫЦЦЯ

**Яго аднаго дастаткова, каб маленькая Рыта перамагла страшную хваробу**



**У сям'і Юшкевіч з Ліды трое дачушак. Малодшай, Рыце, у снежні 2021 года ўрачы паставілі страшны дыягназ — спінальна-мышачная атрафія 2-га тыпу. Каб перамагчы каварную хваробу, дзяўчынцы патрэбны ўсяго адзін укол, кошт якога... амаль два мільёны долараў.**

Усмешлівай Рыце неўзабаве споўніцца тры гадкі. За сваё кароткае жыццё яна паспела перажыць шмат выпрабаванняў. Калі дзяўчынцы споўнілася 2,5 месяца, мама заўважыла несіметрычныя складкі на яе целе. У 4 месяцы малечы наклалі гіпс ад шчыкалаткі да грудзей. З ім яна пражыла паўтара месяца. Потым яшчэ 4,5 месяца з шынай. Пасля яе зняцця Рыта пачала няўпэўнена поўзаць. Думалі, што хутка ўсё наладзіцца. Аднак неўзабаве дзяўчынка перастала нават поўзаць. Пасля перанесенага каранавіруса яе экстранна направілі ў РНПЦ «Маці і дзіця». Там ёй паставілі дыягназ СМА.

Сёння Рыце тэрмінова патрэбна дапамога, бо кожны дзень тысячы нейронаў гінуць у целе дзяўчынкі з-за недахопу бялку, пазбаўляючы яе мышцы тонусу і магчымасці нармальна развівацца. Каб ратаваць Рытачцы жыццё, патрэбны ўсяго адзін укол Zolgensma (Золгенсма). Ён замяніць непрацоўны ген на рабочы. Яго дастаткова ўвесці ўсяго адзін раз! Пасля гэтага спатрэбіцца толькі рэабілітацыя, каб аднавіць раней страчаныя мышачныя функцыі. Кошт прэпарата — 1 819 000 долараў. Збор грошай ідзе ўжо больш за год, але сабрана 10 працэнтаў з невялікім. Тым не менш бацькі Рыты не апускаюць рукі, вераць, што змогуць знайсці неабходную суму, тым самым падарыўшы дачушцы шанц на жыццё.

«Гэта сума непад'ёмная для нашай шматдзетнай сям'і, — са слязамі на вачах кажа мама Рыты Святлана Юшкевіч. — Таму мы вымушаны стукаць ва ўсе дзверы з надзеяй, што нехта адчыніць іх нам і нашай бядзе. Мы будзем удзячны за любую пасільную дапамогу: хтосьці можа дапамагчы рублём, а хтосьці — расказаць пра нас іншым. Любая ваша падтрымка дапаможа нам зрабіць рывок да закрыцця збору на прэпарат Zolgensma. Без уколу Рыта патухае. Ёй нават цяжка трымаць лыжку ў руцэ... СМА павольна і каварна забірае яе сілы... Але ўсё гэта можна яшчэ змяніць. У Рыты ёсць шанц стаць звычайным дзіцём са сваім «Я магу! Я сама!» Я веру, што наша жыццярадасная дзяўчынка-СМАйлік абавязкова будзе хадзіць. Ведаеце, мяне часта пытаюцца, дзе я бяру сілы. Усё проста: я гляджу на сваю моцную дачушку. Зазірніце на нашу старонку ў Інстаграм @rita_sma2 і падзівіцеся, як Рыта пасля рэабілітацыі сама ехала на інвалідная калясцы да машыны. Стомленая, павольна, але сама!»

Дапамагчы маленькай Рыце можа кожны. Самы просты спосаб перавесці грошы на мабільны нумар МТС +375 (29) 264-06-46. Цуды здараюцца там, дзе ў іх вераць. А чараўніком можа стаць кожны.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**






# «ХАЧУ ДАДОМУ. І КАБ МАМА ПАПРАВІЛАСЯ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)



## На першым месцы... алкаголь

Дзеці, якія знаходзяцца ў прытулку, не маюць статусу сіраты. Яны часова адабраныя ў бацькоў. Апошнім даецца шанц на рэабілітацыю, каб спыніцца і задумацца над сваім жыццём. Праўда, карыстаюцца ім, на жаль, далёка не ўсе мамы і таты.

— Калі бацькі хочуць вярнуць дзяцей, гэта відаць з першага дня. Часта ж мамы прыходзяць праз месяц і пачынаюць расказваць, як яны любяць сваіх крывіначак... За 16 гадоў, што ўзначальваю прытулак, я навучылася патрабавальна ставіцца да бацькоў, мяне не правядзеш казкамі пра «заўтра» альбо «не было такога». Мяркую толькі па канкрэтных учынках.

**«Найлепшы варыянт — гэта апека. Як правіла, яе афармляюць бабулі, дзядулі, дзядзькі ці цёткі дзяцей, якія засталіся «сіротамі» пры жывых бацьках».**

— Якія прычыны адабрання дзяцей у бацькоў?

— Часам у прытулак трапляюць брацікі і сястрычкі, бацькі якіх — наркаманы. Ніколі не забудуся, як некалькі гадоў таму забралі ў нарказалежных мамы і таты чацвярых дзяцей-пагодак. Пра тое, што там было ў кватэры, не расказаць. Абадраныя шпалеры, разбітыя дзверы ў пакоі... Мы не маглі знайсці, у што адзець тых дзяцей. Яны хадзілі па кватэры голенькія ці ў памперсе, які быў настолькі поўны, што цягаўся па падлозе. Склалася адчуванне, што дзеці ніколі не былі на вуліцы. Хоць старэйшым было па 3-4 гадзікі, яны зусім не размаўлялі, быццам Маўглі. Жавальны рэфлекс у іх быў на ўзроўні бутэлечкі. У прытулку яны вельмі хутка адаптаваліся і загаварылі. І потым іх забрала пад апеку бабуля. Як толькі да нас паступае дзіця, мы адразу вывучаем усе сваяцкія сувязі. Бо часам бацькі ўтойваюць, што ў іх забралі дзяцей, нават ад бабуль і дзядуляў, калі тыя жывуць у вёсцы. На сёння ў нас каля 140 апякунскіх сем'яў. Я заўсёды радуюся, калі ў дзетак знаходзяцца блізкія сваякі, якія маглі б і хацелі пра іх паклапаціцца.

Яшчэ адна, даволі рэдкая, прычына адабрання дзяцей — гэта калі бацькі не могуць выконваць бацькоўскія абавязкі па сваіх разумовых здольнасцях.

— У нас зараз адзін такі хлопчык ёсць. Яго мама сама сірата. Атрымала сацыяльную кватэру. Выйшла замуж. Згодна з заключэннем урачэбна-кансультатыўнай камісіі, бацькі не ў стане выконваць свае абавязкі. Яны не разумеюць, ні як выхоўваць дзяцей, ні якое харчаванне патрэбна ім у адпаведнасці з іх узростам, ні як зрабіць рамонт у кватэры (жывуць у голых бетонных сценах). А дзяцей трое. Трохгадовы Росцік пакуль знаходзіцца ў нашым прытулку. Двое меншых знаходзяцца ў Доме дзіцяці.

Але гэта адзінкавыя выпадкі. Асноўная прычына, чаму дзеці трапляюць у прытулак, вядома, — п'янства бацькоў. Тацццяна Ізотава прызналася, што сам працэс адабрання, калі практычна сілай адрываеш малечу ў слязах ад маці, якая ледзь трымаецца на нагах, вытрымаць складана. «З гадамі ж выпрацоўваецца імунітэт, мы проста разумеем, што для дзіцяці так будзе лепш».

— Да нас трапляюць у асноўным з тых сем'яў, дзе на першым месцы — алкаголь. Гора-бацькі нідзе не працуюць, жывуць за кошт грошай, якія дзяржава выплачвае на дзяцей. Апошнія ж пакутуюць... Хлопчыкі і дзяўчынкі жывуць у нас максімум шэсць месяцаў. Калі мы бачым, што бацькі нават і не спрабуюць нешта зрабіць, каб вярнуць дзіця, падаём іск у суд на пазбаўленне іх бацькоўскіх правоў. Калі рашэнне суда ўступае ў сілу, шукаем ім замяшчальныя сем'і. На працягу апошніх 15 гадоў мы не змяшчаем дзяцей з прытулку ў інтэрнатныя ўстановы. У нас у Маскоўскім раёне 17 дзіцячых дамоў сямейнага тыпу і сем прыёмных сем'яў, заўсёды знаходзіцца месца там. Але найлепшы варыянт — гэта апека. Як правіла, яе афармляюць бабулі, дзядулі, дзядзькі ці цёткі дзяцей, якія засталіся «сіротамі» пры жывых бацьках.

## Калі ёсць хоць маленькі шанц...

— Але ж ведаю выпадкі, калі гора-бацькі адумваюцца і выпраўляюцца...

— Кожнаму такому выпадку мы радуемся разам з дзеткамі. У прыватнасці, у нас зараз жыве хлопчык. Яго мама зрабіла ў кватэры рамонт. Сужыцеля, які садзейнічаў распіццю спіртных напояў, выгнала. Таму мы плануем у найбліжэйшы час вярнуць Сашу маме. Я не сказала б, што гэта жанчына была моцнай п'яніцай, яна і працавала (хоць зарабляла і няшмат). Але калі яны з сужыцелем запівалі, то халадзільнік быў пусты. А калі хлопчык захварэў, нават грошай на лекі не было.

Мама Барыса таксама не моцна п'е. У цэлым жа прычынай адабрання дзіцяці стала тое, што хлопчык цэлы год не хадзіў у школу. Яна ніяк не магла ці не хацела на гэта паўплываць. А потым Барыс украў электрасамакат... Зараз хлопчык ходзіць у 8 клас. Спачатку было складана, але паступова прывык, разнаёміўся, знайшоў сяброў, і паводзіны ў яго на ўроках неблагія. Мама ж усвядоміла сваю памылку, пастаянна прыходзіць яго праведваць і ўсё робіць для таго, каб сына забраць.

Па статыстыцы, 40 працэнтаў дзяцей вяртаецца ў біялагічную сям'ю.

— Але, на жаль, з гэтых 40 працэнтаў, напэўна, працэнтаў 15 дзяцей трапляюць да нас зноў... Памятаеце, калі заходзілі ў гульнявы пакой, бачылі двух брацікаў, трох і шасці гадоў. Яны такія самастойныя, вельмі перажываюць за сваю маму. Перад Новым годам ёй паставілі ўмову: альбо яна праходзіць курс лячэння, альбо ў яе забіраюць дзяцей. Жанчына тры тыдні ляжала ў бальніцы. Дзеці ўвесь гэты час жылі ў прытулку. Якраз быў Новы год. Ім надарылі столькі падарункаў, што, калі мама прыехала іх забіраць, я жартавала, маўляў, вам трэба самазвал выклікаць, каб іх вывезці. І, што думаеце, не прайшло і месяца, як яна зноў запіла. Дзеці зноў апынуліся ў прытулку, але ўжо па пастанове камісіі па справах непаўналетніх... Але нядаўна жанчына закадзіравалася, прыходзіць праведваць хлопчыкаў кожны дзень. Але алкагалізм — каварная хвароба, трэба вялізная сіла волі, каб з ёй справіцца. А яны яшчэ жывуць у камунальнай кватэры, там агульная кухня на тры сям'і, і ўсе — п'яніцы. Як хлопчыкам жыць у такой атмасферы?.. Разам з тым сёння падстаў, каб не вяртаць дзяцей маме, няма. Я ўвесь час стараюся чапляцца за любую магчымасць, каб толькі захаваць сям'ю для дзіцяці.

**«Не ад добрага жыцця яны тут. Але да апошняга апраўдваюць сваіх бацькоў».**

Сёння ў Маскоўскім раёне сталіцы 405 дзяцей стаяць на ўліку як тыя, хто знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Работнікі прытулка стараюцца як мага раней выяўляць неспрыяльныя сем'і і часова ізаляваць малых. Папершае, таму што маленькія дзеці, у адрозненне ад падлеткаў, лягчэй адаптуюцца да новых умоў, для іх прасцей знайсці замяшчальную сям'ю. Позняе выяўленне дрэннае яшчэ і тым, што дзеці, якім 15+, на жаль, часам становяцца копіяй сваіх гора-бацькоў. І тады дапамагчы ім стаць на правільны шлях вельмі складана... Ды і ў бацькоў, пакуль маладыя, больш шанцаў своечасова адумацца і выкарабкацца з «багны». Бо, як вядома, залежнасць ад алкаголю з часам толькі ўзмацняецца...

*...Калі я выходзіла з прытулка, на першым паверсе сустрэла смуглявую Мар'яну з вялікім белым бантам, якую прыйшла праведаць мама. Дзяўчынка мяне не заўважыла, бо сядзела, утаропіўшыся ў мабільны. Яе ж даволі маладая мама знаходзілася як быццам побач, але глядзела кудысьці ўдалечыню... Увесь вечар мне не даваў спакою той далёкі позірк, а таксама поўныя надзеі словы шасцігадовага Даніка: «Хачу дадому і каб мама хутчэй папраўлася...» Як жа хочацца, каб яна пачула...*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

**Фота носіць ілюстрацыйны характар.**

***P. S.*** *Імёны дзяцей зменены па этычных меркаваннях.*

# Мама на трэніроўцы, тата ў дэкрэце...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Марына — спартсменка ўнікальная. «Закрываць» столькі дысцыплін, колькі яна, мала хто здольны. У яе актыве — перамогі на байдарках-адзіночках, і на чацвёрках яна паспяхова выступае на кароткіх і доўгіх дыстанцыях. На пытанне «У чым сакрэт?» адказвае проста: «Трэба шмат працаваць, адпрацоўваць кожную дыстанцыю, выконваць заданні трэнера». І ў гэтым уся Марына Літвінчук. Яе гонар — галоўныя медалі: «бронзу» Алімпійскіх гульняў 2012 года яна заваявала разам з Вольгай Худзенкай, Надзеяй Папок і Ірынай Памелавай, а «бронзу» ў алімпійскім 2016-м і «серабро» ў 2020-м — разам з Вольгай Худзенкай, Маргарытай Махневай і Надзеяй Папок на байдарцы-чацвёрцы ў дыстанцыі 500 метраў. Пералічваць усе дасягненні Марыны Літвінчук можна бясконца. Яе кар'ера ў лічбах — гэта шэсць залатых, пяць сярэбраных і сем бронзавых медалёў чэмпіянату свету, а таксама сем залатых, шэсць сярэбраных і чатыры бронзавыя медалі чэмпіянату Еўропы. І гэта толькі вынікі з галоўных стартаў! Сама Марына жартуе, што, калі колькасць узнагарод пераваліла за 200, лічыць яна іх перастала: прыкмета дрэнная, ды і часу гэта займае шмат, а ёй працаваць трэба і прысвячаць час мужу і сыну Эльдару.

**Калі ёсць надзейны тыл, нават самыя непераадольныя цяжкасці можна адолець.**

«Мы ніколі не лічылі, у каго медалёў больш. У гэтым і сэнсу асаблівага няма. Зразумела, што ў Марыны іх больш», — заўважае Артур. На прыкладзе сям'і Літвінчукоў можна ўпэўніцца, якім непрадказальным і ад гэтага цікавым можа быць спартыўнае жыццё. У Артура кар'ера аказалася вельмі яркай і імклівай, нібы спрынтарскі заезд. Марына — «марафонец», які шмат гадоў запар не стамляецца ад трэніровак і спаборніцтваў. І кожны з іх — яркая і непаўторная фігура ў вяслярным свеце. За адным вялікім спартсменам стаіць другі вялікі спартсмен. Як жыве чэмпіёнская пара, Марына і Артур Літвінчукі расказалі «Сямейнай газеце».

## Спаборніцтвы ўсё пакажуць

«Тое, што для адносін дрэнна, калі муж і жонка займаюцца адной справай, — абсалютны стэрэатып. Спартсменаў гэта не датычыцца. Ніхто не зразумее спартсмена так, як іншы спартсмен. Мой муж скончыў кар'еру ў 2013 годзе. Але ён заўсёды мяне падтрымлівае, прысутнічае на маіх трэніроўках. Мой муж выйграў галоўныя старты ў свеце і ў жыцці кожнага спартсмена. І ён як ніхто іншы ведае, якая гэта каласальная праца і як штораз трэба пераадольваць самога сябе. Яго падказкі, цярпенне даюць мне дадатковыя сілы, адкрываюць вочы на многія рэчы. Часам ён лепш бачыць, дзе мне трэба прыкласці больш намаганняў, а дзе варта крыху спыніцца і прыслухацца да свайго арганізма», — разважае Марына.

У багатай медальнай калекцыі Марыны Літвінчук не хапае галоўнага экспаната — алімпійскага «золата», да якога яна ідзе, не зважаючы на цяжкасці і выпрабаванні. У спартыўным свеце добра вядома, што Марына Літвінчук трэніруецца да сёмага поту, кожны дзень выконваючы вялізныя аб'ёмы. Старшы трэнер жаночай зборнай па весляванні на байдарках і каноэ Генадзь Галіцкі ў адным з інтэрв'ю расказваў, што Марыну часам на трэніроўках трэба спыняць, яе максімалізм проста зашкальвае. Аднойчы журналісты прыехалі здымаць праграму пра трэніровачны дзень спартсменкі. Праз чатыры гадзіны яны стаміліся проста за ёй назіраць, а Марына ўвесь гэты час напружана працавала.

«Я стараюся ёй нешта раіць, але Марына — вопытная спартсменка, у яе свой пункт гледжання. Таму часта мае парады застаюцца толькі парадамі. Трэніравацца ў адзіночцы, двойцы і чацвёрцы адразу — гэта вельмі цяжка, але рэальна. Марына ў прынцыпе гэта даказвае. Я толькі хвалююся, каб яна не атрымала траўму. Галоўнае — добра рабіць сваю працу, а спаборніцтвы ўсё пакажуць», — сцвярджае Артур.



У 2008 годзе, калі Артур Літвінчук стаў алімпійскім чэмпіёнам, Марына, тады яшчэ Палтаран, у алімпійскую сталіцу не паехала. Спартсменка была ў выдатнай форме, але адабрацца на галоўны старт не змагла. Перашкодзілі абставіны: чэмпіянат свету сярод моладзі 2006 года праходзіў пры пякельнай спякоце каля 40 градусаў, ды яшчэ і заезд перанеслі. Марына кажа, што гэта вельмі паўплывала на настрой, магчыма, добра выступіць не дазволіла і нявопытнасць. У 2012 годзе, калі Марына ў Лондане заваявала свой першы алімпійскі медаль, не выступаў Артур. Мужчынскі экіпаж, які лічыўся непераможным, не адабраўся на Алімпійскія гульні. З часам Артур Літвінчук скончыў спартыўную кар'еру, а Марына ўвайшла ў смак перамог. Хоць гэта было і няпроста. Але калі ёсць надзейны тыл, нават самыя непераадольныя цяжкасці можна адолець. Марына Літвінчук разам з напарніцамі па камандзе ў 2016 годзе змагла стаць бронзавым прызёрам Алімпійскіх гульняў. Калі ўспомніць, што на тыя Гульні дзяўчаты паляцелі без трэнерскага штаба, які быў несправядліва адхілены пасля допінгавага скандалу, можна ацаніць, наколькі каштоўны гэты медаль. Пра тое, колькі праблем спартсменам прынёс 2020 год, ведаюць усе. Але перанос Алімпіяды аказаўся Марыне на руку (у прамым сэнсе) — яна вырашыла даўнюю праблему з плячамі. У Токіа беларуская байдарка-чацвёрка на сваёй каронннай пяцісотцы размяняла бронзавыя алімпійскія медалі на сярэбраныя. Але ў Токіа яны ехалі не па гэта... Таму пасля трох Алімпіяд Марына першая прыязджае на трэніроўку і апошняя ад'язджае. «Каб дабіцца медалёў, рэкордаў, ты павінен жыць гэтым, здзекавацца з сябе і атрымліваць задавальненне», — сцвярджае Марына. І як важна, што побач з ёй чалавек, які гэта разумее і прымае.

## Змог заваяваць алімпійскі медаль? У дэкрэце справішся!

У 2018 годзе Марына і Артур Літвінчукі атрымалі сваю галоўную ўзнагароду — сына Эльдара. На пытанне, ці вернецца Марына ў спорт пасля родаў, адказ быў толькі адзін: канешне, вернецца. «Я лічу, што пры вялікім жаданні і па вялікай любові можна сумяшчаць і сям'ю, і працу. Я трэніравалася да восьмага месяца цяжарнасці. Было цудоўнае цёплае надвор'е, цяжарнасць працякала добра, я выдатна сябе адчувала — чаго мне было дома сядзець? Артур выносіў лодку, і свае пяць кіламетраў я спакойна праязджала. Доктар раіў не трэніравацца, але я пасля кансультацыі пераходзіла дарогу і ішла ў трэнажорную залу. Я ведала, што пасля родаў абавязкова вярнуся ў спорт», — расказвае Марына.

«Вядома, я непакоіўся за яе здароўе, але падтрымліваў, дапамагаў усім чым мог, лодкі выносіў. Іншага выйсця ў мяне не было, Марыне нельга нешта забараніць, Марыну немагчыма спыніць», — дадае Артур.

Для прафесійнага спартсмена кожны прапушчаны месяц — вялікая страта. На першую трэніроўку пасля родаў Марына прыйшла праз паўтара месяца. Хто сумняваецца, што жанчыны здольныя на ўсё?

«Сын нарадзіўся вагой 3600 грамаў, гэтае шчасце не параўнаць ні з адным медалём. Амаль адразу дома я стала з ім на руках прысядаць. Але вяртацца ў спорт было няпроста. Калі змагла ўсяго адзін раз падцягнуцца, спалохалася, бо да цяжарнасці магла і 35 разоў. Сіла сышла, але, на шчасце, засталася тэхніка веславання. Мышачная памяць засталася, таму крок за крокам вярталася ў форму. Дзякуй вялікі мужу за тое, што ўзяў на сябе клопат аб дзіцяці. Ён выдатна спраўляўся з усім. Пакуль я трэніравалася, Артур карміў, купаў сына, мяняў памперсы і па начах уставаў. Нямногія мужчыны на такое здольныя», — расказвае Марына.

**«Тое, што для адносін дрэнна, калі муж і жонка займаюцца адной справай, — абсалютны стэрэатып. Спартсменаў гэта не датычыцца. Ніхто не зразумее спартсмена так, як іншы спартсмен».**

Асаблівасць гэтай сям'і яшчэ і ў тым, што ў дэкрэтны адпачынак пайшоў тата. Нават у наш прагрэсіўны час гэта можа здзівіць. Але сам «вялікі нянь» нічога дзіўнага тут не бачыць: «Тры гады правёў у дэкрэце і хачу сказаць усім мужчынам, што нічога страшнага ці складанага там няма. Пакарміць дзіця, памяняць падгузак, пакласці спаць — што тут складанага? Ды і тут праца спартыўны прынцып: чым больш трэніруешся, тым лепш атрымліваецца. Калі змог алімпійскі медаль выйграць, то і з гэтым справішся. Ну і нам пашанцавала крыху: Эльдар быў дастаткова спакойны, і начамі мы спалі добра. Мусіць, разумееш, што сон — найлепшы спосаб аднаўлення для спартсмена».





## Адлегласці каханню не перашкода

Артур расказвае, што ледзь Эльдару споўніўся месяц, як яму зрабілі пашпарт, і ўсёй сям'ёй адправіліся на збор за мяжу. Графік Марыны прадугледжвае шмат збораў і спаборніцтваў, а сям'я мусіць трымацца разам. Таму на зборы Марына, Артур і Эльдар ездзяць разам. А калі Марына выступае на спаборніцтвах, мужчыны падтрымліваюць яе дома. Хіба для кахання важныя адлегласці?

**«Яго падказкі, цярпенне даюць мне дадатковыя сілы, адкрываюць вочы на многія рэчы. Часам ён лепш бачыць, дзе мне трэба прыкласці больш намаганняў, а дзе варта крыху спыніцца».**

Лагічным уяўляецца пытанне, ці ёсць у Эльдара шанц у будучыні займацца чымсьці іншым, акрамя веславання? Усё ж генетыка — вялікая рэч. Тым больш што, па словах Марыны, Эльдар — сапраўдны фанат лодак. Але яго бацькі ўпэўнены, што сын будзе займацца выключна тым, што выбера сам. А будзе гэта весляванне ці нешта іншае — не мае значэння. Чэмпіёнскія гены спатрэбяцца ў любой справе.

«Спадзяюся, што сын возьме ад мяне працавітасць, якасць, карысную не толькі ў спорце, але і ў жыцці. Я не ведаю, ці працягне ён дынастыю весляроў на байдарках. Я была б не супраць, але падтрымаю любыя яго жаданні. На мой погляд, нашы дзеці павінны быць лепшымі за нас. Вядома, нараджэнне сына мяне змяніла. Я стала, мабыць, мудрэйшай і адназначна больш стрыманай. Стаўшы маці, я зразумела, што ёсць жыццё, даражэйшае за маё, і што ёсць чалавек, якому я патрэбна, як ніхто іншы. Раней у канцы дня я магла думаць аб сваіх трэніроўках, выступленнях, цяпер пасля працоўнага дня мяне хвалююць толькі сямейныя пытанні. Калі гэты маленькі чалавек цябе абдымае, усе працоўныя бязладзіцы забываюцца, і я зноў гатовая на подзвігі. Я стала працаваць больш прадукцыйна, таму што разумею, што сын бярэ з мяне прыклад. З нараджэннем дзіцяці ў маёй душы прачнуліся пачуцці, якія апісаць і зразумець можа толькі маці. Мне хочацца данесці да свайго сына і замацаваць у яго свядомасці, што галоўнае багацце — тое, што ўнутры чалавека, а не грошы і іншыя матэрыяльныя каштоўнасці», — прызнаецца Марына.

Артур называе сучасных дзяцей вельмі цікавымі, а іх выхаванне — займальным заняткам: «Яму пяць гадоў, а ён ужо такі дарослы. Часам мне здаецца, што ён ведае больш за мяне. І такога няпростага маленькага чалавека трэба выхаваць так, каб ён вырас вялікім чалавекам. Узровень адказнасці нават вышэйшы, чым на Алімпійскіх гульнях. Зрэшты, мы з Марынай ужо ведаем, што вынік даюць сур'ёзны падыход і камандная праца. Мы выступалі ў камандных экіпажах, мы ведаем, што такое працаваць у камандзе. Таму ў нас у сям'і няма кагосьці галоўнага. Мы за раўнапраўе, падтрымку і каханне».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Остров чистоты и вкуса

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «СЧАСТЛИВЫЙ СЛУЧАЙ. 6 сезон. Тур 1»

**1. Сведения об организаторе.**

Общество с ограниченной ответственностью «Торговая компания Ромакс» (далее – Организатор). УНП 190761848. Зарегистрирован решением Минского горисполкома от 04.10.2006 г. № 2011. Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 190761848.

Местонахождение Организатора: 220100, г. Минск, ул. Кульман, д. 35А, пом. 8

Почтовый адрес: 220100, г. Минск, ул. Кульман, д. 35А, пом. 8.

**2. Наименование Рекламной игры.**

**«Счастливый случай. 6 сезон. Тур 1».**

**3. Территория проведения.**

Магазины «Остров чистоты», «Остров чистоты и вкуса» на территории Республики Беларусь и интернет-магазины ostrov-shop.by, zht.by, zhs.by, zhi.by.

**4. Сроки проведения.**

27.04.2023 – 30.06.2023 (включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения Рекламной игры).

**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.**

Председатель:

1. Волкова Вероника Александровна, ООО «Торговая компания Ромакс», экономист по материально-техническому снабжению.

Члены комиссии:

1. Раманович Екатерина Владимировна, Частное предприятие «ЗападХимТорг», ведущий специалист по Рекламной коммуникации.

2. Евстратенко Яна Валерьевна, Частное предприятие «ЗападХимТорг», ведущий специалист по рекламной коммуникации.

3. Петрусенко Дарья Сергеевна, Частное предприятие «ЗападХимТорг», специалист по рекламной коммуникации.

4. Стасюк Евгений Владимирович, Частное предприятие «ЗападХимТорг», начальник отдела рекламы.

**6. Перечень продукции, участвующей в Игре.**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования продаж продукции торговых марок Master Fresh, EXXE, EmilyStyle, Fresh Idea, Parlo (далее – товары-счастливчики), реализуемых в магазинах «Остров чистоты», «Остров чистоты и вкуса» и интернет-магазинах ostrov-shop.by, zht.by; zhs.by; zhi.by.

**7. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Рекламной игры.**

Участниками Рекламной игры могут стать физические лица – граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь, достигшие 18 лет, выполнившие условия участия в Рекламной игре.

К участию в Рекламной игре не допускаются члены комиссии.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

Для участия в Игре необходимо в период с 27.04.2023 по 24.05.2023 включительно:

1. Совершить покупку товаров-счастливчиков на сумму не менее 10,00 (десяти) белорусских рублей в любом магазине «Остров чистоты» или «Остров чистоты и вкуса» или в интернет-магазине на интернет-сайтах ostrov-shop.by; zht.by; zhs.by; zhi.by, с использованием при расчете за покупку дисконтной карты «Остров чистоты», «Остров чистоты и вкуса».

Покупатели, осуществляющие расчет за товар на кассе торгового объекта «Остров чистоты» или «Остров чистоты и вкуса» с использованием карт рассрочек («Халва», «Карта покупок», «Карта Fun» и др.), не могут быть участниками Рекламной игры, так как дисконтная карта не может быть применена при расчете картами рассрочек в соответствии с программой лояльности в магазинах «Остров чистоты», «Остров чистоты и вкуса».

2. В личном кабинете в интернет-магазине на интернет-сайтах ostrov-shop.by; zht.by; zhs.by; zhi.by (далее – Интернет-сайт):

2.1. достоверно заполнить персональные данные (либо проверить корректность ранее заполненных данных) в день совершения покупки (или до момента оформления заказа через Интернет-сайт), а именно:

- фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (если такое имеется);
- дата рождения (обязательно);
- адрес проживания, пребывания в Республике Беларусь: область (обязательно), район (обязательно), населенный пункт (обязательно), улица (обязательно, при наличии), дом (обязательно), корпус (обязательно, при наличии), номер квартиры (обязательно, при наличии);
- адрес электронной почты (обязательно);
- абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи участника в международном формате (обязательно);
- оператор сотовой связи А1, МТС, life:) (обязательно).

2.2. Дать согласие Организатору (равно как и Частному предприятию «ЗападХимТорг», ООО «ЗападХимСервис», ООО «ЗападХимИнвест») путем проставления соответствующих отметок на Интернет-сайте:

2.2.1. на обработку персональных данных для использования в целях, связанных с проведением Рекламной игры;

2.2.2. на участие в Рекламной игре.

В случае если согласие на участие в рекламных мероприятиях было дано ранее, повторное подтверждение не требуется.

3. Участник Рекламной игры вправе в любое время в период ее проведения отозвать согласие на обработку персональных данных путем направления соответствующего письменного уведомления в адрес Организатора (равно как и Частного предприятия «ЗападХимТорг», ООО «ЗападХимСервис», ООО «ЗападХимИнвест»).

4. При отказе от дачи согласия на обработку персональных данных либо при последующем отзыве такого согласия участие в Рекламной игре не регистрируется (аннулируется).

5. При отсутствии согласия на участие в Рекламной игре лицо не регистрируется в данной игре в качестве участника.

Игровые коды присваиваются с первого разряда (0000001, 0000002, 0000003 и т. д.) автоматически по порядку.

Участник получает один Игровой код за покупку товаров-счастливчиков на сумму не менее 10,00 (десяти) белорусских рублей в чеке при покупке в торговых объектах «Остров чистоты» или «Остров чистоты и вкуса», на сайте интернет-магазинов ostrov-shop.by; zht.by; zhs.by; zhi.by (например, за покупку товаров-счастливчиков на сумму 55,00 (пятьдесят пять) белорусских рублей в чеке участник получает пять Игровых кодов).

Каждому покупателю, который впервые совершил действия, указанные в пп. 1 и пп. 2 п. 7 настоящих Правил, присваивается следующий после последнего присвоенного, Игровой код на дату и время регистрации на Интернет-сайте.

Каждому покупателю, который совершил повторные действия, указанные в пп. 1 настоящих Правил (и который прошел прежде регистрацию на Интернет-сайте, согласно пп. 2 п. 7), присваивается порядковый Игровой код по дате и времени покупки.

Присвоенные Игровые коды отображаются в диалоговом окне личного кабинета Интернет-сайта в течение 5 (пяти) суток после присвоения.

Каждый участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии соблюдения установленных условий Рекламной игры.

**8. Состав и размер призового фонда. Источники формирования.**

Источником формирования призового фонда является имущество и денежные средства Организатора. Общий размер призового фонда составляет: 26 832,96 (двадцать шесть тысяч восемьсот тридцать два) рубля 96 копеек и включает следующие призы:

| № п/п | Наименование | Кол-во, шт. | Стоимость за ед., бел. руб | Всего стоимость за ед., бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Денежный приз в размере 10 000 белорусских рублей | 1 | 10 000 | 10 000,00 |
| | Денежные средства в размере возмещения подоходного налога за приз | 1 | 1 466,46 | 1466,46 |
| 2 | Стиральная машина BOSCH WAN2408GPL WLM68 (страна производства – Польша) 1710-ES/22-2119,0163/2023 | 5 | 1706,7 | 8533,50 |
| | Денежные средства в размере возмещения подоходного налога за приз | 5 | 184,73 | 923,65 |
| 3 | Пылесос-робот Redmond RV-R640S Белый (страна производства – Китай) 2305-17-4509,0408/2022 | 5 | 699,96 | 3499,80 |
| | Денежные средства в размере возмещения подоходного налога за приз | 5 | 59,37 | 296,85 |
| 4 | Отпариватель для одежды Tefal IT2461E0 (страна производства – Китай) 93154064-8240,0391/2023 | 5 | 300 | 1500,00 |
| | Денежные средства в размере возмещения подоходного налога за приз | 5 | 9,56 | 47,80 |
| 5 | Электроутюг BRAUN SI 3041GR 127405001 (страна производства – Китай) 150422-3774,-3775,0313/2023 | 5 | 112,98 | 564,90 |

**9. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших участников Рекламной игры.**

Розыгрыш призов состоится 01 июня 2023 года в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. Сторожовская, 15, 1-й этаж, малый конференц-зал.

**9.1. Порядок проведения розыгрыша.**

К моменту проведения розыгрыша Организатором формируется список Игровых кодов по возрастанию, сформированный согласно п. 7 настоящих Правил, с указанием фамилии, имени, отчества (при наличии) Участников, номера дисконтной карты, даты подтверждения согласия на участие в Рекламной игре, даты и времени совершения покупки. Игровые коды имеют одинаковую разрядность.

Для проведения розыгрыша используется лототрон, состоящий из 7 секций, каждая из которых соответствует определенному разряду Игрового кода, и несколько наборов шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 до 9. Определение выигрышных Игровых кодов получателей призов происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из секций лототрона. Розыгрыш начинается с первого разряда слева.

За ходом розыгрыша призов следит комиссия по проведению Игры. Итоги розыгрыша призов Игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.

Призовой фонд разыгрывается в последовательности, указанной в п. 8 настоящих Правил.

Игровой код победителя, выигравший один из призов, может признаваться выигрышными только один раз. В случае повторного попадания в Игровой код, уже выигравший один из призов в розыгрыше не участвует, выигрышным считается следующий по списку Игровой код.

Если следующий за выигрышным Игровой код принадлежит победителю, выигравшему один из призов, то выигравшим становится следующий после него первый Игровой код иного участника. В случае если Игровой код попадает на конец списка, то выигрышным будет считаться первый Игровой код иного участника с начала списка.

**10. Срок и способ информирования участников, выигравших призы, место, порядок и сроки выдачи призов.**

Участники-победители будут уведомлены о выигрыше посредством почты и телефонного звонка по 15 июня 2023 года включительно.

Победитель может получить приз лично, предъявляя документ, удостоверяющий личность (паспорт, вид на жительство), или его уполномоченное лицо при предъявлении документов, удостоверяющих его личность и доверенности, полученной и удостоверенной, в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, в офисе Организатора и оригинала дисконтной карты «Остров чистоты и вкуса», «Остров чистоты» по адресу: г. Минск, ул. Кульман, д. 35А, пом. 8, по 30 июня 2023 года с 10.00 до 17.00 в рабочие дни, а также по предварительной договоренности в субботу 17 июня 2022 года с 12.00 до 14.00.

